УДК 37. 01:39

# РОЛЯ ЦАЦАК Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ БЕЛАРУСАЎ

С.У. КАСЦЮКЕВІЧ

*Разглядаецца роля цацак у народнай педагогіцы беларусаў, іх полавая і ўзроставая дыферэнцыяцыя, сувязь з абрадавай практыкай і фальклорам.*

Побыт сучаснага дзіцяці нельга ўявіць без цацак. Іх педагагічная роля вывучалася ў шматлікіх навуковых даследаваннях. Развіццё этнапедагогікі акрэсліла пытынне аб цацках нашых продкаў. Якімі яны былі, якое месца займалі ў жыцці дзіцяці? Адказаць на гэтыя пытанні не проста, бо да нас дайшлі толькі асобныя экзэмпляры цацак, знойдзеныя археолагамі.

Пісьмовых звестак аб народнай цаццы беларусаў амаль не захавалася, паколькі вывучэнню дзіцячай культуры этнографы не надавалі патрэбнай увагі. Этнаграфічныя зборы беларускай народнай цацкі небагатыя. Яны складаюцца з цацак XIX - пач. XX ст., захоўваюцца ў зборах Музея старажытнабеларускай культуры АН Беларусі, Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбургу, краязнаўчых музеяў розных гарадоў Беларусі [1, с. 127]. Зварот да педагагічных якасцяў беларускай народнай цацкі дапаможа вырашыць некаторыя праблемы сучаснай педагогікі (напрыклад, пераадолець насаджэння «тэхнагенных» забак).

Цацка заўсёды нясе на сабе адбітак сацыяльнага ладу грамадства, узроўня яго культуры, нацыянальных, мастацкіх традыцый і эстэтычных запатрабаванняў. Цацка ў народным побыце беларусаў была абавязковай з'явай. Немаўляці яшчэ да таго, як яно пачынала самастойна сядзець, давалі розныя цацкі, каб не плакала. Гульня з імі забаўляла дзіця, і маці ў гэты час магла займацца хатнімі справамі. Дзецям прызначаліся саматробныя цацкі, ці прадметы, якія б не былі вострымі, калючымі, каб «не зрабілі сабе шкоды». Немаўля магло працяглы час гуляць з такімі прадметамі-цацкамі. Час ад часу маці ці старэйшыя дзеці падыходзілі да яго, каб зноў даць згубленую цацку ў маленькія ручкі - «лапуркі» [2, с. 22]. «Цацкай» была і хлебная корка, пернік, сухарык, абаранак, кавалак морквы, бурачка, рэпы або маленькая цурачка, костачка і інш. «Чым бы дзіцёнак ні бавіўся, абы не плакаў» - так лічылі ў народзе. Калі ж цацкі не было, дзіця гуляла са сваімі ручкамі, ножкамі: перабірала пальчыкі, ссала іх. Па народнай прыкмеце такое дзіця лічылі недаўгавечным, а таму стараліся прадухіліць падобныя заняткі і давалі яму цацкі ці забаўляльныя прадметы [3, с. 72]. У сялянскай сям'і цацкам не прыдавалі выхаваўча-развіваючае значэнне. Перш за ўсё трэба было на нейкі час забавіць дзіця, каб мець магчымасць справіцца з хатняй працай.

Падрастаючы, дзіця пачынае разумець, што не кожны прадмет - цацка. Дзяўчынкі апранаюць ляльку або звычайную цурку, якая выконвае ролю цацкі, у «сукенку», «спавіваюць», «кормяць» ляльку. «Лялькай» дзіця называе ўсё, што падобна на людзей («ляля ідзе»), Усе астатнія прадметы гульні ў маленькіх называліся «цацкі, цацы, цыцынькі, цацунькі» [3, с. 73]. Дзяўчынкі гулялі лялькай з маленькага ўзросту і да падлеткавага, а то і пазней. Забавай хлопчыкаў лялька была толькі ў перыяд маленства. Пазней, яны бавіліся цацачным сельскагаспадарчым інвентаром, гулялі ў спартовыя гульні. «Вольнае» жыццё дзіцяці цягнулася нядоўга, у сялянскіх сем'ях пачыналі працаваць з 4 - 5 гадоў па гаспадарцы [4].

Пакупная цацка рэдка трапляла ў дзіцячы быт і з'яўлялася сапраўдным цудам. Цацкі былі самаробныя, зладжаныя бацькамі ці старэйшымі дзецьмі. Падрастаючы, дзеці самі рабілі сабе цацкі. Найбольш пашыранай у дзяцей малодшага ўзросту, асабліва ў дзяўчынак, была лялька з анучы. Добра зробленая яна перадавалася «у спадчыну». Звычайна ляльку шылі з тканіны, выраблялі з паперы, прымацоўвалі валасы з кудзелі, воўны, нітак ці конскіх валасоў. Шылі і адзенне для лялек, нярэдка вельмі ўмоўнае, недэталізаванае. Хоць былі майстрыхі, якія рабілі сапраўдны касцюм, што насілі ў дадазенай мясцовасці, толькі маленькіх памераў. Рабілі ляльки і з гліны, кары дрэва. Абавязковы прадмет для дзіцячых гульняў - мячык - валілі з воўны, рабілі з анучаў, якія, як і поўсць, прапітвалі дзёгцем [3, с. 71]. А.С. Дамбавецкі адзначаў, што дзіцячыя гульні былі не толькі сацыяльна, але і нацыянальна дэтэрмінаваны: калі ў дзяцей беларусаў кнуцік, конік, салдацік, барабанчык, тапорык былі цацкамі для гульні, то ў яўрэйскіх - дзіцячыя цацкі і самі гульні былі звязаны з гандлем, рамяством, пазыкамі і г.д. [5, с. 24].

Таксама як і мастацтва, цацка ў старажытнасці не вылучалася ў асобную вобласць, адасобленую ад міфалогіі, рэлігіі, працы, а існавала ў адзінай сінкрэтычнай сістэме дзейнасці чалавека. Культурная спадчына язычніцкіх у мінулым народаў захавала дзіцячыя цацкі, якія, на думку даследчыкаў, мелі рытуальнае прызначэнне. Сярод іх бразготкі - пустацелыя гліняныя шарыкі, яйкі з каменчыкам ці гліняным шарыкам унутры, фігурныя цацкі-свістулькі. Даследчыкі адзначаюць, у першабытныя часы такія цацкі мелі рытуальнае прызначэнне: свіст і бразгатанне павінны былі адганяць «злых духаў»,

«нячыстую сілу». Фігуркі людзей абазначалі продкаў, хатніх жывёл ляпілі з надзеей паўплываць на дабрабыт [6, с. 387]. У старажытнасці ў фігурках лялек і жывел імкнуліся абысці падабенства з рэальнымі. Ляльку рабілі без твара (часцей - без вачэй), каб не пасяліць у цацку душу.

Цацкі ў выглядзе жывёл выконвалі ролю абярэгаў. Цікавасць прадстаўляюць цацкі з калекцыі № 1292, сабранай А.А. Мілерам для Этнаграфічнага аддзела Рускага Музея Імператара Аляксандра III у 1908 г. Птушка з дрэва знойдзена ў вёсцы Лобанаўка Чэрыкаўскага ўезда Магілёўскай губерні. Прадстаўляе сабой цацку, спінка якой плоская, хвост паўкруглы, ног не мае. Даўжыня фігуркі 16 см. У кнізе паступленняў значыцца пад назвай «вуточка» [7]. Цацку-качку звязвалі з «тым» светам, але сутнасць дадзенай сувязі да канца не разгадана.

На Беларусі сустракаюцца таксама саламяныя цацкі-птахі. Звычайна птахаў падвешвалі пад столь, дзе яны лунали пад уздзеяннем скрызняка. Такія птахі захаваліся з XIX - XX стст. Больш ранніх вырабаў на Беларусі няма, аднак можна меркаваць, што яны былі распаўсюджаны і раней, паколькі ёсць звесткі аб падобных цацках у суседніх народаў [8, с. 40]. Выява сонца ў выглядзе каня, дыска на цаццы павінна берагчы дзіця. У народным мастацтве качка, конь сустракаюцца не толькі ў цаццы, але і ў аздобе ўнутранага інтэр’ера сялянскай хаты. М.М. Нікольскі адзначае, што падобныя выявы выконвалі апотрапейную функцыю [9, с. 14]. Люлька немаўляці ўяўлялася беларусам цэнтрам сусвету, вакол якога кружаць нябачныя духі, каб скрасці душу дзіцяці.

Вельмі папулярнымі ў сялянскім асяродку былі цацкі, зробленыя з гліны. Гэта - рознакаляровыя пеўнікі, баранчыкі, конікі і коннікі і г.д. Сапраўдным дзіцячым цацачным святам мінулага быў кірмаш. Таннасць зыходнага матэрыялу, прастата выканання рабілі цацкі самым жаданым таварам для дзяцей. З-за шматлікасці падобных вырабаў беларускі кірмаш XIX ст. меў не толькі візуальную каларытнасць, але і аўдыяльныя прыкметы: паветра напаўнялася пералівістымі гукамі цацак-свістулек, трашчотак. Дзіцячая псіхіка не дазваляе пакінуць без увагі эксплуатацыйныя магчымасці атрыманай забавы. Правяраліся яны тут жа, што надавала кірмашу непаўторны каларыт, які адзначаюць даследчыкі-этнографы таго часу [10, с. 125]. Некаторыя цацкі (бразготкі, трашчоткі і г.д.) ужываліся пад час святаў (Масленіца), абавязкам дзяцей было трэскам «змагацца» са злымі сіламі [11, с. 57].

З цягам часу ў цаццы паслабеў уплыў старажытных сімвалаў, Майстр-цацачнік рабіўся рэалістам, «конь-сонца» ператвараецца ў «коніка-каталку» на чатырох калёсіках з вазком. Зніклі старажытныя ўяўленні аб светабудове, і разам з імі знікае традыцыйная цацка.

Такім чынам, роля цацак у народнай педагогіцы заключалася ў тым, што яны рыхтавалі мысленне дзіцяці да вытворчай дзейнасці. Цацкі дапамагалі замацоўваць сувязь з традыцыйнай бытавой культурай, засвойваць розныя працоўныя аперацыі і ўсведамляць розніцу полаў. Пры дапамозе цацкі дзіця ўключалася ў сацыяльную структуру традыцыйнага грамадства, усведамляла сваё месца ў ім. Дзяўчынкі, гуляючы з лялькамі, посудам, вучыліся даглядаць маленькіх, шыць, выконваць іншыя бытавыя аперацыі, якія ў будучым спатрэбюцца жанчыне. Хлопчыкі, выкарыстоўваючы ў сваіх гульнях цацк! ў выглядзе прылад працы (плуг, барана, лапата і г.д.), атрымлівалі першыя навыкі сельскагаспадарчай працы мужчыны-селяніна.

## ЛІТАРАТУРА


1. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусь - Мінск: БелЭн, 1997. - 287 с.: іл.
2. Никифоровский Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии // Этнографическое обозрение. - 1897. - № 3. - С. 70- 106.
3. Ракава Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. - Мінск: Ураджай, 2000. - 111 с.: іл.
4. Гоптаревский И. Надзор за крестьянскими детьми в страдную пору // Гроденские губернские ведомости. - 1905. - № 24 - 24.06.1905; Онуфриев М. Детскія игры у белоруссовъ. Село Хоново Быховского уезда // Могилёвская старина. - 1983. - Вып. 3. - С. 88 - 94.
5. Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом описании. - Могилёв-на-Днепре. - 1882. - Кн. 1.
6. Народная культура Беларусі Энцыкл. даведнік. / Пад агул. рэд. В.С. Цітова; Мает. І.І. Бокі, У.М. Жук. - Мінск: БелЭн, 2002 - 432 с.: іл.
7. Расійскі этнаграфічны музей - КП - 1292/119.
8. Lewińska T. Kolorowy świat zabawek. Zabawki ludowe w Polsce. - Kielce: Muzeum zabawkarstwa w Kielcach «Studia i Materiały», 1995. - 137 s.
9. Нікольскі М.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства // Працы секцыі этнаграфіі. - Мінск, 1933. - Вып. 3.-136 с.
10. Гуд П.А., Гуд Н.І. Беларускі кірмаш. - Мінск: Полымя, 1987. - 270с.: іл.
11. Назіна І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. - Мінск: Беларусь, 1997. - 239 с.: іл.